# Паэзія, аздобленая песняй

**У літаратурным клубе «Шчырасць» пры сталічнай бібліятэцы № 22 адбыўся юбілейны творчы вечар кампазітара і ваканаўцы Віктара Мяцельскага.**

Сабраліся пастаянныя ўдзельнікі клуба і чытачы кніжніцы. Сярод ганаровых гасцей — вядомы беларускі пісьменнік і паэт, старшыня Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, кіраўнік клуба «Шчырасць» Міхась Пазнякоў, артыст-парадыст Белдзяржфілармоніі, лаўрэат міжнародных конкурсаў, першы ў Беларусі выканаўца цірольскіх песень Генадзь Санько, паэтэса, выканаўца песень Наталля Галабурда.

Міхась Пазнякоў павіншаваў юбіляра, адзначыўшы яго талент.



*Віктар Мяцельскі.*

Віктар Мяцельскі прыехаў у сталіцу з Пінска. Ён плённа супрацоўнічае з Саюзам пісьменнікаў Беларусі. Ім створана больш за 100 песень на вершы многіх сучасных беларускіх паэтаў.

Пад гітару прагучала шмат песень, якія выклікалі шчырыя апладысменты: «Заклинание» на верш А. Аўруціна, «Заўжды вярнуся», «Снежинка», «Присяга», «К единству» на вершы М. Пазнякова, «Бацькоўская зямля» на верш М. Шабовіча, «Ой хмелю, мой хмелю…» на верш М. Башлакова, «Золотая рыбка» на верш Ф. Баравога. Гучалі і аўтарскія песні Віктара Мяцельскага — «Я спешу жить», «Славный город Пинск», «Зимушка-зима».

Некалькі кампазіцый выканаў і Генадзь Санько, у тым ліку і «Цірольскі вальс». Віктар Сямёнавіч падзяліўся творчымі планамі, марамі, адказаў на пытанні прысутных.

**Аляксандра КАРЖАНЕЎСКАЯ,**
**фота аўтара**